# Адкрыты для ўсіх

***15 ліпеня спаўняецца 121 год з дня нараджэння выбітнага беларускага паэта Уладзіміра Дубоўкі. Сапраўдным падарункам прыхільнікам яго творчасці стала змяшчэнне ў адкрытым доступе на сайце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі збору твораў паэта ў двух тамах.***

Уладзімір Дубоўка быў адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў Усебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк» і Беларускага літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша». Зусім маладым чалавекам, а было яму ўсяго 29 гадоў, паэт стварыў праект беларускага правапісу і азбукі, якім карыстаюцца і сёння.

У 2019 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі распачала віртуальны праект «На хвалі часу, у плыні жыцця», прысвечаны 100-годдзю з дня заснавання «Маладняка», актыўны ўдзел у якім ад пачатку прымаю і я. Частка гэтага праекта, прысвечаная Уладзіміру Дубоўку, была падрыхтаваная да 120-годдзя з дня нараджэння паэта.

У 2017 г. у выдавецтве «Лімарыус» у маім укладанні выйшаў збор твораў У. Дубоўкі ў двух тамах. Цяпер ён даступны на сайце бібліятэкі ў PDF-фармаце. Перад тым, як пачаць алічбоўку двухтомніка, былі заключаны аўтарскія пагадненні з самім выдавецтвам, са мной, як укладальнікам двухтомніка, і з усімі, хто прымаў удзел у рабоце над гэтым выданнем. Калі пачалася праца над часткай віртуальнага праекта да 120-годдзя з дня нараджэння У. Дубоўкі (1900, ці 1901 – 1976), гэты збор твораў быў алічбаваны і ўстаўлены ў праект. Яго можна адкрыць і нават спампаваць з хатняга камп'ютара. Нагадаю, што зборнік выйшаў у серыі «Галасы Айчыны» накладам усяго 200 асобнікаў.

Алічбоўкай двухтомніка займаўся вядучы інжынер аддзела суправаджэння інтэрнэт-партала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Яўген Скібскі. Фактычна ён зрабіў невялікую апрацоўку файлаў, дасланых мне выдавецтвам у 2021 г. Неўзабаве алічбаваны варыянт двухтомніка быў змешчаны спачатку ў частцы віртуальнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», прысвечанага







У. Дубоўку, а крыху пазней і ў электронным каталогу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Такім чынам, сёння любы карыстальнік бібліятэкі можа прачытаць гэты двухтомнік, не выходзячы з дома. Нацыянальная бібліятэка Беларусі мае гэтае выданне і ў папяровым выглядзе (пяць экзэмпляраў). Таму чытачы, якія любяць чытаць папяровыя кнігі, могуць заказаць двухтомнік на хатні абанемент ці ў чытальную залу.

На заканчэнне хочацца шчыра падзякаваць усім, хто прымаў удзел у стварэнні гэтай кнігі і яе алічбоўцы.

***Зміцер ДАВІДОЎСКІ***